STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 6, ROK 2006

*Людміла Сегень*
*Беласток*

# Эпітэт у паэзіі Максіма Багдановіча

Эпітэт адносіцца да аднаго з самых шырока распаўсюджаных паэтычных тропаў. Яго месца і роля ў мастацкім тэксце вывучаюцца здаўна. Аднак творчасць кожнага значнага мастака слова дае падставы для аўтаномнага разгляду гэтага вобразнага азначэння прадмета, з'явы, пачуцця.

Значную цікавасць у плане выкарыстання эпітэта ўяўляе паэзія Максіма Багдановіча і, у прыватнасці, яго нізкі вершаў *У зачарованым царстве* і *Думы*, змешчаныя ў кнізе *Вянок*. Вобразнасць, сэнсавая насычанасць, эмацыянальная паўната мастацкага азначэння даюць магчымасць часта адным мазком стварыць "абразок"[1], зафіксаваць трапяткое імгненне і ўражанне.

Паэт знаходзіць самыя неабходныя, дакладныя словы, як, напрыклад, у вершы *Плакала лета...* (67)[2]: ***прыгожая***, ***ясная восень***, ***асеннія***, ***успаёнкыя***, ***родныя***, ***бледныя кветкі***, ***надарваная душа***. У вершы *Зімой* (72), М. Багдановіч, выкарыстоўваючы эпітэты ***звонкі*** вечар, ***скрыпучы***, ***мяккі*** снег, ***легкія*** санкі, стварае жывы, зрокава адчувальны малюнак зімовай прыроды. Ёсць, аднак, у вершы азначэнні, якія нясуць у сабе канкрэтную інфармацыю аб прык-

[1] Н. Пыско, *Імпрэсіяністычныя тэндэнцыі ў творчасці Максіма Багдановіча*, [у:] Зборнік дакладаў «Лёс нацыянальнай культуры на паваротах гісторыі», Мінск 2000, с. 84.

[2] М. Багдановіч, *Поўны збор твораў у 3 т.*, Мінск 1993, т. 1, с. 50–126. (Тут і далей спасылкі на гэта выданне даюцца ў тэксце з указаннем старонкі).

метах прадмета і называюцца лагічнымі. Параўнаем: *зімовая* ноч – *сінявокая, нахмураная* ноч, *летняя* бура – *жыццёвыя, цяжкія* буры, *горная* рака – *між горліючайся* ракі, *сівая* барада – *снегавая* барада, ён *малады* – ён *жаўтадзюбы, снежная* мяцель – *сп'янелая* мяцель, *дзявочы* твар – *васковы* твар, *хуткі* вецер – *буйны* вецер. Эпітэтамі тут з'яўляюцца азначэнні – *сінявокая, нахмураная, жыццёвыя, цяжкія, снегавая.* Яны выконваюць функцыю ацэнкі, характарыстыкі прадмета, адносін аўтара да прадмета[3].

Для вызначэння эпітэта выключную ролю мае кантэкст[4], паколькі менавіта тут адбываецца змена ў словаўжыванні, перанос значэння слова, семантычнае пераўтварэнне для стварэння мастацкага вобраза і сувязь яго з іншымі словамі ў сказе. Напрыклад, прыметнік *салаўіная* выступае як нечаканае акрэсленне (непрадбачанае)[5]. У сваю чаргу азначэнне *салаўіная* (у словазлучэнні салаўіная песня – песня, якую пяе салавей) – звычайнае, лагічнае. У вершы ж М. Багдановіча *Сэрца ные, сэрца кроіцца ад болю...*, гэтае азначэнне мае характар эпітэту:

Я тады б у песні *звонкай салаўінай*
Выліў тугу і на вецер буйны кінуў (84).

Эпітэт *жоўты* выступае у вершы *Вадзянік* у нязвыклай ролі:

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся – сплю на дне ракі.
Твар травой аблутана,
Быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне
*жоўтыя* пяскі (55).

Сон Вадзяніка – увасабленне і перасцярога – у такой вечнасці няма выйсця, яна не менш вечная, чым смерць, растварэнне ў прыродзе, зліццё са светам, якое нібы вызваляе ад трагізму індывідуальнасці, дзе мастацкае азначэнне *жоўты* паказвае пратэст супраць смерці, выклік часу, надыход новых часоў, светлых, чыстых, як жаўцізна пяску[6].

---

[3] Н. Гаўрош, *Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы*, Мінск 1991, с. 3–4.
[4] *ТСБМ*, Мінск 2005, с. 390.
[5] A. Kuławik, *Poetyka. Wstęp do teorii dzieła literackiego*, Kraków 1997, s. 92–95.
[6] М. Багдановіч, *Поўны збор твораў...*, с. 470–471.

Эпітэты, выражаныя словамі ў пераносным значэнні, называюцца метафарычнымі[7]. У іх спалучаюцца два тропы – эпітэт і метафара. М. Багдановіч часта выкарыстоўвае метафарычныя азначэнні: (месяц) цягне з возера *срэбныя* ніці – перанос колеру серабра, бляску і чысціні на адлюстраванне святла на вадзе; мудрай прамовы – мёд *залацісты* (122) – бярэцца пад увагу не колер мёду, а яго крыштальны, найлепшай якасці гатунак, якой і павінна быць праўдзівая прамова.

Пры апісанні прыроды метафарызацыя ў М. Багдановіча з'яўляецца важным сродкам індывідуалізацыі стылю. Ён выкарыстоўвае народна-паэтычныя эпітэты – *буйны* вецер, традыцыйныя – з чупрынаю *белаю*, як лунь і таксама ўласна-індывідуальныя, калі аўтар гнутка ўлівае ў свае вершы словы – *мора-акіян*, *белая* палатніна, па-майстэрску аперуе імі.

У большасці выпадкаў у ролі эпітэта ў М. Багдановіча выступаюць **прыметнікі**, простыя і складаныя *старыя, пажоўклыя* страніцы, *блёклы, высахшы* лісток, *шчырыя* думкі (51); бор *стары, нязнаны* свет (53); месяц *белы заплаканы, срэбныя* ніці (54); *белая* палатніна; *дробны* дождж (56); *вясёлыя* струны; *прыдарожная* груша; *танкаствольныя* сосны; *сінякрылы* матылёк; *жоўтадзюбыя* (80). Якасныя: *жоўтыя* пяскі, *зялёная* лаза, *сінявятыя* зоркі, *белая* палатніна; адносныя – *нязнаны* свет, *цёмная* глыбіня, *срэбныя* ніці, *адвечны* сон, *залаты* серп (месяца), *зімовы* вырай, *грымотная* хмара (58), *бяздольныя* хмары, *вясёлыя* струны (59), *гаротная* доля (60).

Знаходзім ў кнізе М. Багдановіча *Вянок* шматлікія прыклады, калі функцыю эпітэта выконваюць і іншыя часціны мовы:

**прыслоўі**: гэта сумны, маркотны лясун// пачынае *няголасна* грацьі (52);

**назоўнікі**, дапасаваныя да назоўнікаў, назоўнікі з прыназоўнікам: Добрай ночы, *зара-заранiца*! (63); гэта хмара – *дыван-самалёт* (74); і нясеш іх к *мору-акіяну* (92); ў *гутарках-казках* аб шчасці, аб згодзе (107); і зліліся з ёю ліўнем *кропель-слёз* (117); нуда *без патолі*, *таварышы-браццяя*, *родзіна-маць* (111);

**дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі**: *блёклы, высахшы* лісток (51), у *нязнаны* свет акно (53), месяц *белы заплаканы* свеціць (54), *знік-*

[7] *Литературный энциклопедический словарь*, Москва 1987, с. 513.

*шы* дзень, плывучы сон (60), *заснуўшыя* паляны, *прыстаўшая* птушка (64), *дрыжачы* жах, час *жаданы*, кветкі *ўспаёнпыя* (66), душа *надарваная* (67), *аплятаючыя*ногі (павукоў), *разрытая* магіла, *згорблены* я (69), *сіняватыя* зоркі, *развярушаны* вецер, вянкі зорак *дрыжачых*, сэрца *дрыжачага, скрыпучы* снег, *пахаладзеўшыя* зоркі (71), *дрыжачыя* крылы (75), *збалелыя* вочы, *мінулыя* ўчынкі, *зіяючыя* крамы, *пужлівых* людзей (97);

**спалучэнне прыслоўяў з прыметнікамі і дзеепрыметнікамі**: быццам тысячы *крэпка нацягнутых* струн (52), *крэпка скутая* снегам зямля, днёў *пуста пранёсшыхся* (65), *ціха гусцеючым* змрокам (98), *даўно забытай* кнігі, *строга сціснутых* губах (101).

Прыведзеныя прыклады сведчаць, што азначэнні-эпітэты ў паэта часцей выражаны прыметнікамі, дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі, якія спалучаюцца з назоўнікамі, утвараючы атрыбутыўнае словазлучэнне. Значна менш знаходзім азначэнняў, выражаных назоўнікамі, але яны выключныя, больш выразныя, вобразныя. Таксама ў невялікай колькасці прадстаўлены азначэнні-эпітэты, выражаныя прыслоўем.

**Адзіночныя, простыя эпітэты**, даведзеныя да адной слоўнікавай адзінкі – слова[8], М. Багдановіч падбірае, каб паказаць неабсяжную палітру не толькі колеру, але і асацыятыўную якасць: напрыклад, агні – *жоўта-чырвоныя*, *сінія*, *гарачыя*; бляск – *цёмны*, *яркі*, *цудоўны*; вада – *цёмная*, *мглістая*, *халодная*, *бурлівая*; віно – *снежнае*, *вінаграднае*, *густое*, *цёмнае*; грудзі – *моцныя*, *хворыя*, *слабыя*, *кволыя*; цвяты – *срэбныя*, *бледныя*, *мёртвыя*; дзень *знікшы*, *пуста пранёсшыхся*; зоркі *бахматыя*, *сіняватыя*, *пахаладзеўшыя*; кветкі *асеннія*, *успаёныя*, *родныя*, *бледныя*; месяц *белы*, *заплаканы*, *вільготны*, *залаты*, *круглы*, *чырвона-жоўты*, *празрысты светлы стоўп* (месяца); ноч – *сінявокач*, *асенняя*, *нахмураная*, *глухая*, *цёмная*; песня – *маёвая*, *звонкая*, *салаўіная*; рукі – *рухавыя*, *чорныя*; свет – *нязнаны*, *сетлы*, *жывы*; снег – *халодны*, *скрыпучы*, *мяккі*, *халодная сталь* (снегу); хмары – *грымотныя*, *празрыстыя*, *лёгкія*, *магутныя*, *бяздольныя*, *панурая вялізная* (жывёла); хмель – *светлы*, *халодны*, *дзікі*, *тонкі*; я – *сівавусы*, *згорблены*, *жаўтадзюбы*. Колькасць эпітэтаў, ужытых ў дачыненні да аднаго назоўніка, розная: ад некалькіх – да дзесятка, кожнае акрэсленне ў кантэксце верша мае сваё непаўторнае значэнне, як, напрыклад, месяц *белы*, *вільготны*, *бледны*, *круглы*, *залаты*, *спусціў прызрысты стоўп* – аўтар дае магчымасць нам не толькі бачыць, а датыкаць, суправаджае вобраз "псіхалагічнымі" эпітэтамі.

---

[8] В. А. Ляшчынская, *Слова ў паэзіі Янкі Купалы*, Мінск 2004, с. 101.

Нярэдка сустракаюцца **два эпітэты побач**, яны ўзмацняюць вобраз, надаюць яму большы каларыт: *сумны маркотны* лясун, *сівавусы згорблены* я, *зімовы цёплы* вырай, *панурая вялізная* жывёла, *празрыстая лёгкая* хмара, *цёмная і глыбокая* чарка (возера), хмель *светлы і халодны*, *рэдкі прывідны* туман, *цёмная люстраная* зямля, у небе *вячэрнім зялёным*, *змрочная заснуўшая* зямля, *мглістая халодная* вада, *прыгожая ясная* восень, *родныя бледныя* кветкі, *тлусты мяккі* павук, *марозны звонкі* вечар, *скрыпучы, мяккі* снег, *празрысты светлы* стоўп (месяца), *ціхі ясны* гімн, *сухі высокі* чарот, *раздольны вольны* свет, *звонкая салаўіная* песня, з *мілым задушэўным* зыкам, *жорсткая бурая* кожа, *чыстая сцюдзёная* вадзіца, *жоўтымі скрыпучымі* пяскамі, *стары няхібкі* мужык, з *прывольных палявых* дарог, *цесны крывы* завулак, *глухія старасвецкія* будынкі, *асенняй нахмуранай* ночы, *бледны млосны* дрот, *міндаловы горкі* пах, *светлы жывы* свет, *мужны кіпучы* верш, хмелем *светлым і тонкім*, *бледным мертвым* цвятам.

Нярэдка ўжываецца ў *Вянку* **адзін эпітэт да двух ці больш назоўнікаў у адным вершаваным радку**: *яркі* бляск і цень, *бледныя* хаткі, таполі, бярозкі, *шматфарбныя* застаўкі, замалёўкі.

Яшчэ адной адметнасцю вершаў М. Багдановіча з'яўляецца тое, што падбор эпітэта праводзіцца па розных якасцях прадмета, дзе нярэдка бывае якасны прыметнік і адносны, як бы характарыстыка аб'екта з двух бакоў – звонку, аб'ектыўнага (якасны прыметнік, які абазначае ўласцівасці прадметаў, рысы характару, колеры, пачуццёвыя ўспрыманні[9]) і знутры суб'ектыўнага (адносны прыметнік, які выражае прыкметы прадметаў па адносінах да асобы[10]): *шырокім цёмным* полі, *сівавусы, згорблены* я; *зімовы, цёплы* вырай; *цёмная, люстраная* зямля.

Радзей ужываецца побач тры эпітэты: *цесных душных падзямельных* норак, *шпаркі сінякрылы лёгкі* матылёк, *ярка-чырвоныя, жоўтыя, бурыя* баразды (у небе), вярбіны *зялёныя свежыя каравыя*, гадзін *панурых нудных шэрых*, народ *родны, бедны, няшчасны*, *вінаграднае густое цёмнае* віно.

Асобныя прыметнікі – эпітэты могуць суправаджаць розныя назоўнікі і з'яўляцца паўтаральнымі[11]. Напрыклад, *белы* выступае эпітэтам да назоўнікаў – месяц, палатніна, лунь, бярозы, пух (вішняў),

[9] Я. М. Адамовіч, *Беларуская мова*, Мінск 1992, с. 180.
[10] Тамсама, с. 185.
[11] Тамсама, с. 101.

вопратка, чупрына, пена, дзень; *бледны* – рог, кветкі, дрот, цвяты; *беднае* – сэрца, хаткі, таполі, бярозкі, хлопец, народ, старана, я; *горкая* – доля, кветкі, пах; глухі бор, будынак, вулкі, ноч, дно; *зімовы* – вырай, няволя, дарога, маска (снегу); *панурая* – жывёла (хмара), коні, людзі, гадзіны; *прыгожаю* – восенню, пыл, труд, кірыліца; *срэбныя* – сеці, ніці, змейка, туман, рыза, засцёжкі, рака, цвяты; *светлы* – пыл, хмель, шлях, стоўп (месяца), згадкі, свет, хмель; *халодная* – раса, вакно, бічы, хмель, вада, кроў, снег, сталь, срэбра, лёд, верш, каменні; *цёмная* – глыбіня, неба, бляск, чарка, вада, зямля, цені, даль, шыбы, імгла, мрок, віно, ракавіна; *ясная* – восень, гімн, даль, зарніца, дзень, сны. Аднак паўтор эпітэта, які характарызуе розныя прадметы ці з'явы, кожны раз выконвае сваю адметную эстэтычную функцыю, гэта іншы вобраз, які выклікае новыя асацыяцыі.

Звяртае ўвагу тое, што ў М. Багдановіча рэдка сустракаюцца экзатычныя эпітэты, хутчэй – простыя, заснаваныя на тонкім пачуцці светаўспрымання, перапрацоўкі ў метафарычнае спалучэнне – *месяц заплаканы*, *агністы меч*, *бяздольныя хмары*, *разварушаны вецер*, *плывучы сон*, *заснуўшыя паляны*, *люстраная зямля*, *дрыжачае сэрца*, *вольная паводка*, *зялёнае неба*, *вільготны месяц*, *прыгожы пыл*, *важкі сум*, *снежнае віно*, якія падкрэсліваюць выразнасць мовы, ствараюць незабыўны вобраз, уздзейнічаюць на пачуцці чытача.

Акрамя гэтага паэт вызначаецца пошукамі арыгінальных эпітэтаў, напрыклад: *бахматыя* (як пышныя кароны дрэў) зоркі, *збалелыя* (вочы, у якіх відаць адбітак горкага лёсу) вочы, *горкія* (што нясуць пэўнае расчараванне) кветкі.

Колеранайменні з'яўляюцца ўвогуле неад'емнай часткай слоўніка кожнага мастака, паколькі апісанне самых розных рэалій жыцця не можа абысціся без ужывання гэтай групы лексікі. Вядома, што ў мастацкім творы каларатывы выкарыстоўваюцца ў намінатыўнай функцыі і толькі гэтым іх ўжыванне не абмяжоўваецца, бо яшчэ для аўтара важнай з'яўляецца сэнсавая шматпланавасць слоў[12]. Ужыванне паэтам каляровых азначэнняў не абмежавана назвамі колераў храматычнай ці ахраматычнай груп. Згадаем, што да храматычнай, ці асноўнай групы адносяцца сем колераў вясёлкі – чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы, да ахраматычнай – белы, чорны і ўсе шэрыя колеры[13]. У Максіма Багдановіча выдзеляецца і трэцяя група колераў,

[12] Я. М. Адамовіч, *Беларуская мова*, с. 45–48, 103–104.

[13] Л. Миронова, *Цветоведение*, Минск 1984, 286 с.

дзе колеры нельга аднесці ні да храматычнай ці ахраматычнай груп – поліхромнай – *агністы* (чырвона-жоўты) меч, *бледны* (амаль бясколерны) рог, кветкі, дрот, цвяты; *бледна-сіні* (бясколерны з дадаткам сіняга) маладзік; *бурыя* (шэравата-карычневы) барозды (у небе), кожа (псальмы); *бліскучая*; *вясёлкавыя* (уся група храматычных колераў) іскры; *васковы* твар; *жоўта-чырвоны*; *залаты* серп, рожкі, струны, змей, месяц; *залацісты* мёд; *зіяючыя* крамы; *іржавыя* берагі; *няяркае* серабро; *празрыстая* хмара, стоўп (месяца); *рознакалёрныя* галоўкі (літар); *срэбныя*; *серабрыстыя* сеці, ніці, змейка, туман, рыза, засцёжкі, рака, цвяты; *сінявастыя* зоркі, дым, даль; *светлы* пыл, хмель, шлях, стоўп (месяца), згадкі, свет, хмель; *сінеючыя* снягі; *снегавая* барада; *чырвона-жоўты* месяц; *шматфарбныя* застаўкі; *ярка-чырвоныя*.

Даследчык Гадані Карой выдзяляе наступныя падгрупы поліхромнай гамы колераў: 1) прыметнікі, якія абазначаюць якасці паверхні і характар адлюстравання, напрыклад, *бліскучы*, *зіяючы*; 2) прыметнікі, якія абазначаюць прысутнасць альбо адсутнасць колеру і колькасць колеру – *няяркі*, *рознакалёрны*; 3) прыметнікі, якія абазначаюць роўную асветленасць – *бледны*; 4) прыметнікі, якія выражаюць якасць пранікнення святла праз паверхню – *празрысты*[14]. Як бачым, выкарыстанне колеру храматычнай ці ахраматычнай груп не дае поўнага малюнку аўтарскага светаўспрымання. Праз фізічныя магчымасці колеру ён прапануе чытачу ўбачыць свет звычайных прадметаў. Храматычная група – *жоўтыя* пяскі, барозды (у небе); *зялёная* лаза, неба, вярба; *краснае* сонца; *сіняя* даль; *чырвоны* веер, макі, кавалкі (вугля), жар. Ахраматычная – *белы* месяц; *чорная* рыза, рукі; *шэрая* зязюля; *цёмная* глыбіня, неба, бляск, чарка (возера), вада, зямля, цені, даль, шыбы, імгла, поле, ноч, змрок, віно, ракавіна.

Заўважым, у Багдановіча няма багатай палітры святлаколернага спектра – гэты спектр не раскладаецца на асобныя яго складнікі. Слова ў Багдановіча гранічна дакладнае, выразнае і, адначасна, агульнае па сэнсу (месяц *прыгожы, сумны, адзінокі, поўны, белы, чырвоны, зялёны, сіні).* Гэта нібы дапамагае зблізіць, згрупаваць як мага болей падобных адзін да аднаго і непадзельных па сваёй глыбіннай сутнасці з'яў. Нераскладальнасць колеру падкрэслівае плыткасць і размытасць межаў паміж рэчамі і з'явамі, адчування-

[14] Г. Карой, *Сопоставительная характеристика прилагательных цвета в некоторых славянских языках*, Автореферат на соискание ученой степени кандидата филологических наук, Минск 1984, с. 3–6.

мі і вобразамі ў мастацкім свеце М. Багдановіча[15]. Тым больш, храматычная і ахраматычная групы прадстаўляюць традыцыйны спектр колераў, што абмяжоўвае выбар найбольш трапнага азначэння, абвострана-пачуццёвага. Калі і трэба паказаць колер, паэт падбірае звычайнае азначэнне, а большасць гэтых каларатываў метафарычныя і азначаюць не колер прадмета, а яго якасць, або адносіны да прадмета, з'явы. Пераважаюць колеры цёмныя (*цёмны*, *бледны*, *сінеючы*, *бледна-сіні*, *празрысты*), яны супрацьпастаўляюцца *светламу* (а нават чырвона-жоўты, ці жоўта-чырвоны), што звязана з асабістым фізічным станам паэта, які адчувае свой блізкі немінучы канец.

Вельмі цікавае ўжыванне ў М. Багдановіча эпітэта *зялёны* – незвычайны, незямны колер, колер д'ябла, колер, які мае рознае сэнсавае напаўненне (не рэдкая з'ява ў мадэрнісцкай паэтыцы)[16]. Як бы сама прысутнасць месяца, а ён шмат разоў называецца "зялёным", загадкавы сэнс на зямлі, калі падыходзіць пара чараў, праклёнцаў, перамен. Паэт піша ў іншым вершы, што *месяц хутка стане снегавым* (85), або *вільготным* (72), ці *белы*, *заплаканы* (54) – гэта таксама метафарычны эпітэт, як і метафарычнае выказванне.

Незвычайнае акрэсленне ці спалучэнне прыметніка-каларатыва з назоўнікам незвычайна ўздзейнічаюць на чытача, выклікаюць новыя асацыяцыі. Метафарычны эпітэт *чорны* ў вершы *Краю мой родны! Як выкляты Богам...* (107) выкарыстоўваецца да азначэння людскіх рук, якія выконваюць чорную, брудную працу, працу на зямлі, а разам з тым працу, без якой не існаваў бы чалавек. Далей у вершы *Добрай ночы, зара-заранiца!* (63) паэт прадстаўляе імглу як чорную рызу, якая пакрывае зямлю.

Эпітэт у М. Багдановіча просты, бязмежна насычаны не фізічнымі параметрамі, а больш якасцю, якая выходзіць знутры і ўспрымаецца "на дотык". Узаемадзеянне фізікі і метафізікі, ад невялікай колькасці колераў храматычнай групы, таямніча зялёнага, цёмнага спектра мастацкай палітры колераў – да рэдкіх успышак чырвона-жоўтага, выкарыстанне розных часцін мовы ў ролі мастацкага азначэння, ад простых прыметнікаў – да дзеепрыметнікаў з прыслоўямі, традыцыйных азначэнняў, ўзятых з фальклору – ўсё гэта з'яўляецца творчай асаблівасцю М. Багдановіча. Ён, безумоўна, на высокім узроўні валодае псі-

[15] В. Максімовіч, *Праблема духоўнай сублімацыі і антрапацэнтрычны ідэал паэта ў мастацкай візіі М. Багдановіча*, [у:] Зборнік дакладаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «І прад высокаю красою», Мінск 2001, с. 32.

[16] Тамсама, с. 33.

халогіяй і эстэтыкай, калі рэдкія паэтычныя азначэнні накіроўваюць чытача, прымушаюць глыбей зразумець унутраны сэнс твора.

Эпітэт Максіма Багдановіча перадае чыста аптычныя ўяўленні, эцюднасць, фрагментарнасць, затрымлівае час, каб імгненне працягвалася ў вяках.


## STRESZCZENIE

Rozpatruje się wykorzystanie przez klasyka białoruskiej literatury M. Bagdanowicza epitetu w cyklach „У зачарованым царстве" i „Думы", zamieszczonych w zbiorze „Вянок". W większości przypadków w roli epitetu Bagdanowicza występują przymiotniki proste i złożone. Często jednak funkcję epitetu wykonują przysłówki, a w niewielkim stopniu też imiesłowy i rzeczowniki. Gama kolorów jest ograniczona od niewielkiej ilości chromatycznej palety barw do tajemniczo zielonego, ciemnego i bladego, co pobudza wyobraźnię czytelnika. Epitet Bagdanowicza jest znacząco nasycony sensami, jakością płynącą z wnętrza przedmiotu i odbieraną na „dotyk".